**ЛЫЗІКАЎ** Мікалай Фядосавіч (н. 13.12. 1920, в. Бароньki Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р мед. н., праф. (1969). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1977). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1951), працаваў у ім да 1991 (у 1959—85 заг. кафедры). Навук. працы па афтальмабленарэі нованароджаных, ускладненнях цяжарнасці і родаў.

*Тв.*: Принципы ведения беременности и родов, осложненных преждевременным излитием околоплодных вод // Акушерство и гинекология. 1969. № 7; Преждевременное отхождение околоплодных вод. Мн., 1971.